**Л. П. Дземідзенка**
Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны

# ТЭСТАВЫЯ ЗАДАННІ ПА РАЗДЗЕЛУ «СІНТАКСІС»

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Курс «Сучасная беларуская мова. Сінтаксіс» займае важнае месца ў сістэме лінгвістычных дысцыплін для студэнтаў-філолагаў спецыяльнасці «Беларуская філалогія». Неабходнасць вывучэння дадзенага курса прадугледжана стандартам і вучэбным планам падрыхтоўкі спецыялістаў-філолагаў. Актуальнасць вывучэння дадзенай дысцыпліны абумоўлена цікавасцю да сінтаксічных уласцівасцей слоў, іх спалучэння ў словазлучэнні і сказы. Пры засваенні гэтага курса студэнты атрымліваюць грунтоўныя веды аб разнастайных моўных з’явах у галіне сінтаксісу і пунктуацыі, выпрацоўваюць навуковыя погляды на сінтаксічную сістэму сучаснай беларускай літаратурнай мовы, набываюць і паглыбляюць веды па асноўных пытаннях раздзелаў «Сінтаксіс» і «Пунктуацыя».

Пры напісанні разнастайных тэкстаў філолаг павінен выдатна валодаць не толькі нормамі сучаснай арфаграфіі, але і правіламі спалучэння слоў у словазлучэнні і сказы, а таксама правіламі пастаноўкі

знакаў прыпынку. У гэтым і заключаецца неабходнасць і актуальнасць курса «Сучасная беларуская мова. Сінтаксіс».

Асноўнай задачай дадзенага курса з'яўляецца аваладанне студэнтамі асаблівасцямі сінтаксічнай і пунктуацыйнай сістэм сучаснай беларускай мовы, грунтоўнымі ведамі ў галіне асноўных сінтаксічных пытанняў. На практычных занятках студэнтамі разглядаюцца такія тэмы, як словазлучэнне, просты сказ, ускладнены просты сказ, розныя тыпы складаных сказаў. Усё гэта садзейнічае таму, што яны засвойваюць шматлікія правілы сінтаксісу і пунктуацыі, а таксама ўменне выкарыстоўваць разнастайныя веды на практыцы.

З гэтага навучальнага года (2020) ва УА «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт» уводзіцца новая сістэма ацэнкі ведаў студэнтаў – тэставыя заданні, якія выконваюцца студэнтамі за камп'ютарамі. Па дзвюм тэмам «Просты сказ ускладненай будовы» і «Складаны сказ» намі было складзена дзвесце тэстаў, з якіх камп'ютар выбраў толькі пяцьдзясят. Гэта значыць, што сто пяцьдзясяць тэстаў засталіся па-за разглядам. Засяродзім увагу на станоўчых і адмоўных баках гэтаў новай сістэмы ацэнкі ведаў студэнтаў.

З аднаго боку – гэта намнога аблягчае працу выкладчыка, тым што не патрабуе асабістага ўдзелу яго ў ацэнцы ведаў студэнта (калі тэсты набраныя і ўведзены ў сістэму).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

З другога боку не ўсе тэмы па розных прадметах магчыма дакладна разгледзець у выглядзе тэстаў.

Спынімся больш дакладна на раздзеле «Сінтаксіс». У асноўныя задачы курса уваходзіць наступнае: засваенне дастатковай колькасці тэарэтычных ведаў для ўсведамлення сінтаксісу і пунктуацыі як самастойных раздзелаў мовазнаўства; фарміраванне ўяўленняў студэнтаў пра асноўныя паняцці сінтаксічнай і пунктуацыйнай сістэмы беларускай мовы, аспекты і метады пунктуацыйна-сінтаксічнага даследавання моўнага матэрыялу.

Трэба адзначыць, што з дапамогай тэстаў лёгка праверыць наколькі студэнты атрымалі і засвоілі тэарэтычныя веды, сфарміравалі ўяўленні пра сінтаксічную і пунктуацыйную сістэму беларускай мовы. Наступныя задачы курса – фарміраванне ўменняў і навыкаў выкарыстання тэарэтычных ведаў для вырашэння канкрэтных лінгвістычных задач у галіне сінтаксіс і пунктуацыі; аваладанне ўстойлівымі навыкамі самастойнай інтэрпрэтацыі моўных з'яў. А гэта ўжо практыка.

Большасць тэм, які разглядаюцца на практычных занятках, а гэта такія, як словазлучэнне, класіфікацыя простых сказаў, галоўныя і

даданыя члены сказа, тыпы аднасастаўных сказаў, няпоўныя сказы лажацца пад тэставую сістэму ацэнкі ведаў. Значна цяжэй, калі размова ідзе пра пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах ускладненай будовы і складаных сказах, дзе выконваючы тэст студэнт можа выпадкова патрапіць на правільны адказ, а аргументаваць пры вусным разглядзе не можа. Прывядзём прыклады з тэста:

Адзначце сказ, у якім знакі прыпынку пастаўлены правільна:

Барыс Барысавіч, так звалі нашага настаўніка, ніколі не злаваўся на тых вучняў, якія былі слабейшыя за іншых.

Пасажырскія цягнікі – маскоўскі і брэсцкі – спынялі тут роўна на тры хвіліны.

Лабановіч – так звалі маладога настаўніка – слухаў апавяданне бабкі з цікавасцю.

Ля канторы стаяла машына, нехта прыехаў.

Вялізны бегемот, гіпапатам, паволі вылазіў з вады;

Адзначце складаназлучаны сказ, у якім знакі прыпынку пастаўлены няправільна:

Над вадой возера ціха спіць асака ды лаза зялёная жаліцца-шуміць.

Плывуць у неба самалёты, у даль імчацца цягнікі.

На дварэ было цёмна – затое ў хаце ярка гарыць электрычнасць.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Не то загукала сава, не то прапішчаў заяц.

Спявайце, сябры, на высокай гары, каб чуваць былі песні далёка ў бары.

Узнікае і другое пытанне: на практычных занятках мы вучым студэнтаў будаваць схемы ўсіх тыпаў складаных сказаў. У тэставай сістэме праверыць тое, наколькі яны навучыліся гэта рабіць проста немагчыма. Адзінае мы падаём ужо гатовыя схемы і прапануем сказ, які падыходзіць да адной са схем. Прыклад з тэста:

Адзначце схему, якая адпавядае сказу: Зачыняйце шчыльна дзверы, каб не дзьмулі халады, на акно кладзіце вату, каб не клаў мароз сляды .

[ ], [ ], [ ], (каб).

[ ], (каб), [ ], (каб).

[ ], (каб), [ ], (каб).

(каб), [ ], (каб), [ ].

[ ], (каб), [ ], (каб).

Студэнты-філолагі пасля размеркавання прыходзяць працаваць у школу, дзе абавязкова будуць разглядаць дадзеныя пытанні. А вось наколькі гэта будзе адпавядаць правільным адказам невядома.

Такім чынам, з надзеяй на лепшае будзем спадзявацца, што вывучэнне курса «Сучасная беларуская мова. Сінтаксіс» дапаможа студэнтам авалодаць сінтаксічным багаццем сучаснай беларускай літаратурнай мовы і будзе садзейнічаць павышэнню прафесійнага ўзроўню студэнтаў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ